Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

Серыя «Асоба ў гісторыі малой радзімы»

# ЗАЛАТАЯ ЗОРКА КОБРЫНА

Біябібліяграфічны паказальнік
да 100-годдзя з дня нараджэння
**Кірмановіча Уладзіміра Мікалаевіча**

Кобрын
2019

УДК 016:[908(476.7)(092)+929Кірмановіч]
ББК 91.9:68(4Беи)
322

Серыя заснавана ў 2014 годзе

***Складальнік:***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі Кобрынскай раённай
цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы *С. Д. Курачук*

322 **Залатая зорка Кобрына** : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2019. - 28 с. : іл. – (Серыя «Асоба ў гісторыі малой радзімы»).

Біябібліяграфічны паказальнік прысвечаны Герою Савецкага Саюза, Ганароваму грамадзяніну горада Кобрына Уладзіміру Мікалаевічу Кірмановічу (1919-2001). Паказальнік змяшчае біяграфічны нарыс, спіс крыніц аб яго жыцці і дзейнасці. Адрасаваны ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, дасягненнямі людзей, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё нашай малой радзімы.

**УДК 016:[908(476.7)(092)+929 Кірмановіч]**
**ББК 91.9:26.89(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма, 2019

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Біябібліяграфічны паказальнік прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Мікалаевіча Кірмановіча - нашага знакамітага земляка, ваеннага дзеяча, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза, Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына.

Імя і жыццё У. М. Кірмановіча набылі славу і шырокую вядомасць нашаму гораду. Для роднага Кобрына ён назаўжды застанецца адзіным кабрынчанінам з высокім воінскім званнем - Герой Савецкага Саюза.

Паказальнік мае наступную структуру:

Біяграфічны нарыс

*Дзяцінства і юнацтва*

*Ваенная служба*

*Подзвіг Героя Савецкага Саюза*

*Пасляваенныя гады*

*Памяць*

Бібліяграфічныя матэрыялы

*Аб жыцці і дзейнасці*

У раздзеле «*Аб жыцці і дзейнасці*» творы друку згрупаваны па відах: главы, раздзелы з кніг, часопісныя і газетныя артыкулы, найбольш стабільныя электронныя рэсурсы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у

алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Мова бібліяграфічных апісанняў адпавядае мове выданняў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі. Анатацыі прыведзены на мове анатаванага дакумента. Уключаны артыкулы з газет на беларускай і рускай мовах за 1995-2019 гады.

Бібліяграфічныя запісы ў паказальніку складзены ў адпаведнасці з міждзяржаўнымі стандартамі «ГОСТ 7.1-2003 Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления», «ГОСТ 7.80-2000 Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления», метадычнымі рэкамендацыямі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Оформление библиографического списка к научной работе».

Выданне прадстаўляе каля 50 бібліяграфічных крыніц.

У паказальніку выкарыстаны фатаграфіі з архіваў Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава і музея дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 2 г. Кобрына».

Выданне адрасавана студэнтам, вучням, настаўнікам, бібліятэкарам, краязнаўцам, экскурсаводам і ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, дасягненнямі людзей, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё нашай малой радзімы.

# БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС

## *Дзяцінства і юнацтва*

Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч нарадзіўся 5 лістапада 1919 года ў горадзе Кобрыне Гродзенскай губерні (цяпер г. Кобрын Брэсцкай вобласці) у сям'і рабочых.

Яго маці Лізавета Іванаўна, ураджэнка Лунінца, была дачкой чыгуначнага майстра - чалавека паважанай пры цары прафесіі. З нябеднай сям'і быў і бацька Мікалай Іосіфавіч: яго дзед валодаў землямі ў раёне вуліцы Мікольскай, зямельнымі надзеламі ў раёне плошчы Леніна і парку імя Суворава. Сваё сумеснае жыццё Мікалай Іосіфавіч і Лізавета Іванаўна звязалі з Кобрынам, менавіта тут у іх сям'і і з'явіўся на свет першынец - сын Уладзімір. Лізавета Іванаўна да таго часу была хатняй гаспадыняй, Мікалай Іосіфавіч - чорнарабочым, але шматлікія хваробы неўзабаве прымусілі яго пакінуць і гэты заробак. Нягледзячы на такое нялёгкае становішча, у сям'і здолелі вырасціць і годна выхаваць чацвярых дзяцей. «*Усяго ў нашай сям'і,* - успамінае малодшая сястра Уладзіміра Кірмановіча Марыя Мікалаеўна Алесік, - *было сямёра дзяцей, але два браты і сястра памерлі зусім маленькімі».*



***У. М. Кірмановіч з бацькамі, сёстрамі, жонкай*** *(з архіва музея сярэдняй школы № 2 г. Кобрына)*

Дзіцячыя і юнацкія гады Валодзі прайшлі ў Кобрыне на вуліцы Мікольскай, дом № 18. «*Гэтыя гады для яго*, - успамінае малодшая сястра, - *не былі бестурботнымі. Адзіны сын у сям'і, ён з дзяцінства дапамагаў бацькам па гаспадарцы. Уладзімір рос вясёлым хлопчыкам, у яго заўсёды было шмат сяброў…*».

З дзіцячых гадоў хлопчыка адрознівала любоў да ўсяго жывога: ён вельмі любіў ганяць галубоў і даглядаць за хатнімі жывёламі, у дзяцінстве ў яго нават была свая галубятня, а крыху пазней ён развёў трусоў.

У 1926 годзе Уладзімір пайшоў вучыцца ў Кобрынскую павятовую школу (цяпер сярэдняя школа № 2 г. Кобрына). Вучыўся добра, з павагай ставіўся да настаўнікаў. Доўгія гады пасля заканчэння школы ён перапісваўся і пры магчымасці сустракаўся са сваім першым настаўнікам Карліцкім.

Пасля заканчэння сямігодкі Уладзіміра, як дзіця з беднай сям'і, узялі да сябе на навучанне каталіцкія манахі, якія ў адной з хат па вуліцы Першамайскай арганізавалі сталярную майстэрню пры апякунскім доме імя Св. Ёзэфа. Менавіта тут ён навучаўся тонкасцям майстэрства чырванадрэўшчыка.



***1937 год***

Цэлы год пасля навучання Уладзімір добрасумленна і бясплатна працаваў на сваіх настаўнікаў і толькі пасля гэтага адправіўся ў Плянту, дзе працаваў па спецыяльнасці да 1939 года. У вёску дабіраўся на ровары, на якім у вольны час вучыў катацца

сваіх сясцёр Людмілу, Валянціну і Марыю.

Але дзяцінства хутка скончылася, а дарослае жыццё прад'явіла свае патрабаванні.

## Ваенная служба

У 1939 годзе пасля прыходу ў Заходнюю Беларусь Савецкай улады Уладзімір Кірмановіч быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Восем месяцаў служыў у горадзе Луга Ленінградскай вобласці, удзельнічаў у Фінскай вайне.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Кірмановіч на фронце. Тады ні ён, ні яго сям'я нават і ўявіць не маглі, што з гэтай вайны ён вернецца героем. Бацькі і сёстры Уладзіміра ўсю вайну правялі ў акупацыі, сувязь паміж імі абарвалася надоўга.

Да часу нападу на нашу краіну фашыстаў Уладзімір Кірмановіч быў ужо вопытным артылерыстам. У жніўні 1941 года ён накіраваны ў Маскву, дзе ў званні сяржанта стаў камандзірам гарматы ў 25-м запасным артылерыйскім палку Маскоўскай зоны абароны (МЗА). У 1942 годзе малады і адважны салдат скончыў курсы малодшых лейтэнантаў і прыняў пад сваё камандаванне батарэю 202-й танкавай брыгады (19 танкавы корпус, 51 Армія, 4 Прыбалтыйскі фронт). Баявое хрышчэнне атрымаў у маі 1942 года ў складзе 48-й арміі Бранскага фронту.

У верасні 1942 года Кірмановіч атрымаў воінскае званне лейтэнанта. У адным з баёў быў паранены. Пасля шпіталя зноў на фронце.

У гады ваеннага ліхалецця Уладзімір Кірмановіч камандаваў знішчальнай процітанкавай батарэяй на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м

Прыбалтыйскіх франтах. Удзельнічаў у Курскай бітве, вызваленні Украінскай ССР, Крыма, Прыбалтыкі.

За адзнаку ў баях за райцэнтр Арлоўскай вобласці пасёлак Драскова, за горад Малаархангельск Уладзімір Кірмановіч быў узнагароджаны першай баявой узнагародай - ордэнам Чырвонай Зоркі. У ліпені 1943 года за гераізм, праяўлены ў абарончых баях на Курскай дузе, лейтэнант Кірмановіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Падчас баёў на Арлоўшчыне ён пазнаёміўся з Еўдакіяй - дачкой старшыні аднаго з калгасаў, якая стане для Уладзіміра вернай спадарожніцай да канца жыцця.

У ходзе наступлення на Данбас Уладзіміру Кірмановічу прысвоілі званне старшага лейтэнанта і прызначылі камандзірам знішчальна-процітанкавай артылерыйскай батарэі ў 79-й танкавай брыгадзе корпуса. У гэтай якасці ён 8 верасня 1943 года ўдзельнічаў у баях за горад Сталіно (Данецк).

24 кастрычніка 1943 года ў баі за станцыю Акімаўка на паўднёвы захад ад г. Мелітопаля вызначылася яго батарэя, за што старшы лейтэнант Кірмановіч быў узнагароджаны яшчэ адным ордэнам Чырвонай Зоркі.



***Пасля бою, 1943 год*** *(з архіва Кобрынскага музея імя А. В. Суворава)*

У сакавіку 1944 года яму прысвоена званне капітана. За вылучэнне ў баях у Крыме капітан Кірмановіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Але самая галоўная падзея жыцця, якая змяніла і паўплывала на ўвесь яго далейшы лёс, была яшчэ наперадзе.

## Подзвіг Героя Савецкага Саюза



Самы важны ў лёсе камандзіра батарэі Уладзіміра Кірмановіча бой адбыўся амаль у канцы вайны - 22 жніўня 1944 года. Падчас танкавай контратакі ў раёне пасёлка Букайшы Добельскага раёна Латвійскай ССР батарэя пад яго камандаваннем прыняла на сябе першы ўдар ворага і гэтым забяспечыла паспяховае наступленне савецкіх войскаў.

У пасёлка Букайшы гітлераўцы буйнымі сіламі танкаў і пяхоты імкнуліся спыніць наступленне савецкіх войскаў і адваяваць важны рубеж, які пакінулі напярэдадні. Двум нашым танкавым падраздзяленням і процітанкавай батарэі Кірмановіча было загадана тэрмінова заняць пазіцыю для абароны. Прыбыўшы ва ўказаны раён, артылерысты занялі зыходную пазіцыю і сталі чакаць ворага. Праз некаторы час з-за пагорка адзін за адным паказаліся тры варожыя танкі. Артылерысты былі гатовы адкрыць па іх агонь, але камандзір батарэі Кірмановіч, які ўважліва сачыў за дзеяннямі ворага, не

аддаваў каманды. Гітлераўскія танкі-разведчыкі, нічога не знайшоўшы, павярнулі назад і схаваліся за пагоркам. Неўзабаве яны зноў з'явіліся перад пазіцыяй артылерыстаў. За першымі трыма ішлі яшчэ дзесяць танкаў ворага. За імі рухалася пяхота, а потым яшчэ танкі…

Камандзір батарэі пільна сачыў за варожымі машынамі, і толькі калі апошнія танкі праціўніка апынуліся ў выгадным становішчы для ўдару, ён загадаў адкрыць агонь. Артылерысты на чале з камбатам стварылі цуд у першыя ж хвіліны бою. Чатыры гарматы ўдарылі адначасова. Ад першага залпу загарэліся тры варожыя танкі, затым успыхнулі яшчэ два. Цяпер гітлераўцы ўжо заўважылі артылерыйскую батарэю і сканцэнтравалі ўвесь агонь на яе. З'явіліся параненыя, выйшлі са строю дзве гарматы, але нашы байцы, якія засталіся ў жывых, працягвалі весці агонь.

Загарэўся шосты фашысцкі танк. Нягледзячы на моцны агонь, вораг працягваў азвярэла наступаць на батарэю. У гітлераўцаў у гэтым баі было шмат танкаў і самаходак, таму яны працягвалі наступленне, нягледзячы на страты. Завязаўся кровапралітны бой. Трупамі фашысцкай пяхоты, што падтрымлівала танкі, было ўсеяна поле бою, былі страты і ў батарэі Кірмановіча. Капітан Кірмановіч, нягледзячы на тое, што вораг быў літаральна побач, умела кіраваў агнём сваіх гармат. У крытычны момант бою, калі адзін з разлікаў выйшаў са строю, камбат асабіста ўстаў за панараму і з гэтай гарматы знішчыў яшчэ два варожыя танкі. Вораг не змог пераадолець стойкасць і мужнасць савецкіх артылерыстаў. Неўзабаве ў атаку

пайшлі савецкія танкі, якія завяршылі разгром праціўніка. Пасля 5-гадзіннага бою вораг адкаціўся назад і больш не прадпрымаў на гэтым участку ніякіх дзеянняў. За гераізм, праяўлены ў гэтым баі, У. Кірмановіч быў прадстаўлены да высокага воінскага звання.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, за ўмелае вядзенне бою і выяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм капітану Кірмановічу Уладзіміру Мікалаевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка» (№ 7588).



***У Георгіеўскай зале Крамля падчас ўручэння медаля «Залатая Зорка», У. М. Кірмановіч - трэці справа***

*(з архіва музея сярэдняй школы № 2 г. Кобрына)*

Уладзімір Мікалаевіч стаў першым і адзіным кабрынчанінам, удастоеным гэтага высокага воінскага звання.



Шматлікія заслугі Уладзіміра Мікалаевіча Кірмановіча ў гады Вялікай Айчыннай вайны адзначаны ордэнамі Леніна (24.03.1945), Чырвонага Сцяга (02.05.1944), Аляксандра Неўскага (09.11.1944), двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені (22.01.1945; 06.04.1985), ордэнам Айчыннай вайны II ступені (02.09.1943), трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі (16.03.1943; 06.01.1944; 30.12.1956), медалямі. Ён удзельнік двух гістарычных парадаў на Чырвонай плошчы ў Маскве: 7 лістапада 1941 года і 24 чэрвеня 1945 года.

## Пасляваенныя гады

Герой Савецкага Саюза У. М. Кірмановіч сустрэў Перамогу, знаходзячыся за мяжой. Ён працягваў службу ў арміі ў артылерыйскіх частках Паўднёвай групы войскаў, пражываў у Аўстрыі і Румыніі. Сюды ж прывёз і Еўдакію. У першы год мірнага жыцця адправіўся ў далёкую Арлоўшчыну, каб назаўсёды звязаць з ёй свой лёс. Ужо жанатым Уладзімір не раз прыязджаў на малую радзіму пабачыць бацькоў і сясцёр. Неўзабаве ў іх нарадзіўся сын Валерый. Ураджэнец Вены, па вяртанні бацькоў у Савецкі Саюз ён стаў кабрынчанінам.

Вярнуўшыся з-за мяжы, маладая сям'я нядоўга жыла



ў Кобрыне. Пасля нараджэння дачкі Наталлі Уладзімір Мікалаевіч усё часцей задумваўся пра паступленне ў ваенную акадэмію. Ён вырашыў цалкам прысвяціць сябе службе ў арміі, таму ў 1950 годзе разам з сям'ёй адправіўся ў Ленінград, дзе паступіў на курсы падрыхтоўкі ў лётную акадэмію, а затым у ваенна-авіяцыйную акадэмію імя М. В. Фрунзе ў Маскве.

У 1958 годзе яму прысвоена званне палкоўніка.

Пасля заканчэння вучобы ў 1956 годзе У. М. Кірмановіч разам з сям’ёй пераязджае на пастаяннае месца жыхарства ў Харкаў. Жыццё Уладзіміра Кірмановіча ў гэтым горадзе звязана з Харкаўскім вышэйшым ваенным вучылішчам лётчыкаў імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца, у якім ён доўгія гады працаваў выкладчыкам на кафедры тактыкі.

За гады працы ў вучылішчы ў Уладзіміра Міхайлавіча прайшло навучанне шмат лётчыкаў вышэйшага класу, у іх ліку і былы міністр абароны Яўгеній Шапашнікаў.

Моцнае ўражанне аказваў легендарны выкладчык на сваіх курсантаў. Як успамінае выпускнік 1975 года Харкаўскага вышэйшага ваеннага вучылішча, маёр запасу, ваенны лётчык І класа, сёння кабрынчанін Вячаслаў Амшаннікаў, Уладзімір Мікалаевіч вельмі цёпла адносіўся да курсантаў, удзяляў ім шмат часу. Аднак, нягледзячы на

вясёлы характар, спуску Герой Савецкага Саюза, якога ў



вучылішчы паважліва называлі «алавяны салдацік», курсантам не даваў і ганяў іх «да сёмага поту». Таму і тактыку яго вучні засвойвалі дасканала, што не раз спатрэбілася ім у будучым.

У 1975 годзе ў званні палкоўніка (на той час ён займаў пасаду намесніка начальніка па страявой падрыхтоўцы) Уладзіміра Кірмановіча камісавалі. Але ісці на заслужаны адпачынак ён не збіраўся. З 1975 года амаль да апошніх дзён жыцця палкоўнік у адстаўцы працаваў у сваім лётным вучылішчы ў лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання.

З характарыстыкі У. М. Кірмановіча:

«*Герой Советского Союза, полковник в отставке Кирманович Владимир Николаевич в Харьковском высшем военном авиационном училище летчиков имени дважды Героя Советского Союза С. И. Грицевца с 1960 по 1975 год проходил службу преподавателем кафедры тактики. Все эти годы Владимир Николаевич тесно связан с обучением и воспитанием будущих летчиков-истребителей. Своим трудолюбием, скромностью, активной общественной деятельностью он снискал любовь и уважение всего коллектива училища. Он принципиален, непримирим к недостаткам, терпелив в обучении. Владимир Николаевич – ударник коммунистического труда, член совета ветеранов. Неоднократно избирался депутатом местных Советов. Он частый*

*гость на тематических вечерах, участвует в проведении пионерских игр «Зарница». Наши курсанты всегда берут себе в пример героя»*.



***У. М. Кірмановіч прымае ў піянеры ўнучку,***
***1980 год, Харкаў***
(з архіва Кобрынскага музея імя А. В. Суворава)

За 45 гадоў, праведзеных у Харкаве, Уладзімір Мікалаевіч неаднойчы наведваў родны Кобрын, дзе жылі яго родныя і сябры. «*Владимир*, - успамінаюць родныя Кірмановіча, якія жывуць у Кобрыне, - *всегда трепетно относился к своим родным: регулярно приезжал в Кобрин на могилу родителей, из Харькова от него постоянно приходили письма и фотографии. Владимиру всегда было дорого то, что связано с его семьей и его родным городом*».

У 1987 годзе У. М. Кірмановічу прысвоена званне Ганаровага грамадзяніна горада Кобрына (рашэнне Коб-

рынскага гарадскога Савета народных дэпутатаў № 237 ад 15.09.1987 года).




Герой Савецкага Саюза, першы і адзіны выхадзец Кобрыншчыны, які атрымаў такое высокае званне, палкоўнік У. М. Кірмановіч памёр 5 лютага 2001 года на 82-м годзе жыцця. Заслужаны і аддаены вайсковай службе чалавек пахаваны на алеі герояў у Харкаве.

Жыццёвы подзвіг Уладзіміра Мікалаевіча Кірмановіча і ў ваенны, і ў мірны час - прыклад беззапаветнага служэння Айчыне, узор для пераймання шматлікім пакаленням кабрынчан.

## Памяць

Такія людзі, як Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч, не сыходзяць з жыцця бясследна. Яны пакідаюць пасля сябе памяць. Памяць аб тым, што такі чалавек быў і здзейсніў подзвіг, які дазволіў упісаць яго імя ў гістарычны летапіс.

Свой ваенны подзвіг У. М. Кірмановіч назаўжды пакінуў нашчадкам: у Санкт-Пецярбургскім музеі артылерыі - асабістыя старонкі ў кнізе герояў, на абеліску герояў у Кіеве - сваё прозвішча.

Любоў да ваеннай службы Уладзімір Мікалаевіч перадаў сыну Валерыю Уладзіміравічу - выпускніку Маскоўскай акадэміі імя Жукава, цяпер палкоўніку ў адстаўцы. Сваім дзецям, сыну і дачцэ Наталлі Уладзіміраўне, выпускніцы Харкаўскага медыцынскага

інстытута, дыпламаванаму ўрачу-кардыёлагу, ён быў добрым і клапатлівым бацькам, па-вайсковаму строгім, але справядлівым. А шматлікія сябры і калегі памятаюць яго вясёлым і жыццярадасным чалавекам.

На малой радзіме У. М. Кірмановіча памятаюць, паважаюць яго імя, навечна захаванае ў назвах вуліц, галерэях Славы, музейных экспазіцыях і простай чалавечай памяці тых, хто яго ведаў. Для роднага Кобрына Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч назаўжды застанецца Ганаровым грамадзянінам і адзіным мясцовым Героем Савецкага Саюза.

12 кастрычніка 2005 года на сесіі раённага Савета дэпутатаў было прынята рашэнне аб прысваенні вуліцы ў квартале індывідуальнай забудовы на тэрыторыі былога ваеннага гарадка імя земляка-героя У. М. Кірмановіча.



На будынку сярэдняй школы № 2 г. Кобрына ўстаноўлена мемарыяльная дошка, надпіс на якой абвяшчае, што ў гэтай школе вучыўся Герой Савецкага Саюза У. М. Кірмановіч.







У школе арганізавана піянерская дружына імя У. М. Кірмановіча «Алые паруса».



Да 100-годдзя з дня нараджэння У. М. Кірмановіча ў гісторыка-краязнаўчым цэнтры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі дзейнічала юбілейная выстаўка-партрэт з цыкла выстаў «Асоба ў гісторыі малой радзімы». Створаны краязнаўчы электронны паўнатэкставы рэсурс «Залатая зорка Кобрына. *Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч*», які прадстаўлены біяграфічным нарысам,

артыкуламі з энцыклапедый, кніг, перыёдыкі аб жыцці і




дзейнасці знакамітага земляка, фондам фотаздымкаў, бібліяграфічнымі выданнямі цэнтральнай бібліятэкі, матэрыяламі з найбольш стабільных інтэрнэт-рэсурсаў; сфарміравана папка–дасье з аднайменнай назвай; выдадзены даведнік аб вуліцах Кобрына, якія носяць імёны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны «Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых», даведнік-тур па вуліцах горада «Імёны тваіх вуліц, горад Кобрын» з серыі «Ведай і любі свой горад», у якіх ёсць інфармацыя пра героя-земляка. На галоўнай старонцы сайта Кобрынскай РЦБС (www.krcls.by) на банеры «У Календары нашай




памяці» размешчана пашыраная даведка з бібліяграфічным спісам, прымеркаваная да юбілейнай даты нашага знакамітага земляка.




**На малой радзіме
з пакалення ў пакаленне
перадаецца памяць
пра ГЕРОЯ,
які прымножыў славу
кобрынскай зямлі**

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Баграмян, И. Х.** Так шли мы к победе / И. Х. Баграмян. - М. : Воениздат, 1977.

**Долготович, Б. Д.** Кирманович Владимир Николаевич / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 30-32.

**Долготович, Б. Д.** Кирманович Владимир Николаевич / Б. Д. Долготович, А. А. Коваленя // Созвездие героев земли белорусской / Б. Д. Долготович, А. А. Коваленя. – Минск, 2019. - С. 156-157.

**Залатая** зорка Кобрына. **Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч //** Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 239 : фат.

**Их подвиг** и труд награждены звездой Героя. **Владимир Николаевич Кирманович** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Кірмановіч** Уладзімір Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Минск, 1999. - Т. 8. – С. 280.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Минск, 1972. – Т. 5. – С. 590 : фота.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5. Біяграфічны даведнік. - С. 304 : фота.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 264.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. – С. 181.

**Кірмановіч У. М**. // Героі Савецкага Саюза і Беларусі – ураджэнцы Брэстчыны : партрэты-плакаты. – Брэст, 1999.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – С. 286.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. – Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 454, 517.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 48.

**Кирманович** Владимир Николаевич = **Кірмановіч** Уладзімір Мікалаевіч // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. – Мінск, 2010. – С. 516-517.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Герои Советского Союза : краткий биографический словарь. – М., 1987. – Т. 1. - С. 652.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Героическая Брестчина / сост. С. Ф. Омелюсик. – Брест, 2015. - С. 16.

**Кирманович Владимир Николаевич** // От парада надежды к Параду Победы. 7 ноября 1941 г., 16 июля 1944 г., 24 июля 1948 г. / сост. : Б. Д. Долготович, М. Г. Никитин. – Минск, 2015. – С. 22, 176.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза : биографический справочник. – Минск, 2015. – С. 65.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Навечно в сердце народном.- Минск, 1977. - С. 200.

**Кобрынскі** раён. 1941-1945 // Памяць Беларусі : Рэспубліканская кніга. – Мінск, 2005. – С. 118-121.

На Кобрыншчыне нарадзіўся Герой Савецкага Саюза У. М. Кірмановіч.

**Марецкая, М.** Синее небо в сердце моем / Марьяна Марецкая. – Минск : Услуга, 2019.

См. на с. 134 (В. Н. Кирманович, преподаватель Харьковского ВВАУЛ).

**О присвоении** звания Почетных граждан города Кобрина [Милоянину И. Ф., Кирмановичу В. Н., Селюку П. Д.] : решение Кобринского городского Совета народных депутатов, 15.09.87 г., № 237. – Кобрин, 1987.

**Белов, Д.** Штурмовые крылья Кобринщины / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2020. - 15 жніўня (№ 63). - С. 9 : фот.

Майор запаса, военный лётчик I класса В. М. Амшанников вспоминает о Герое Советского Союза В. Н. Кирмановиче.

**Вовк, Ю.** Подвиг Владимира Кирмановича / Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2020. – 27 февраля (№ 9). – С. 3.

**Курачук, С.** Золотая звезда Кобрина / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2019. – 31 октября (№ 44). – С. 4.

В рамках проекта Кобринской центральной районной библиотеки - материал к 100-летию со дня рождения Владимира Кирмановича.

**Курачук, С.** Залатая зорка Кобрына / Святлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2019. – 6 лістапада. – С. 5.

У рамках праекта Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі аб славутых земляках малой радзімы - матэрыял да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Кірмановіча.

**Свиридюк, Д**. Мой прадедушка – Владимир Кирманович / Диана Свиридюк // Кобрынскі веснік. – 2015. – 15 красавіка. – С. 3.

Рассказ внучки о двоюродном прадедушке В. Н. Кирмановиче, Герое Советского Союза.

**Свиридюк, Д**. Мой прадедушка – Герой Советского Союза / Диана Свиридюк // Заря. – 2015. – 23 апреля. – С. 6.

Рассказ внучки о двоюродном прадедушке В. Н. Кирмановиче, Герое Советского Союза.

**Фридлендер, Н.** «Нет героев от рожденья, они рождаются в боях…» / Наталья Фридлендер // Кобрин-информ. – 2014. – 17 июля. – С. 11.

О Героях Советского Союза – В. Кирмановиче, А. Морозове.

**Золотая** звезда Кирмановича // Кобрин-информ. – 2009. – 17 сентября. – С. 26.

**Курига, Е.** Золотая звезда Кирмановича / Е. Курига // Кобрин-информ. – 2008. – 2 ноября. – С. 3.

**Мурашкина, М.** Имена земляков – улицам города / Мария Мурашкина // Кобрынскі веснік. – 2005. – 22 кастрычніка.

**Савчук, А.** Чтобы помнили / А. Савчук // Кобрин-информ. – 2003. – 6 ноября.

О земляках, прославивших Кобринщину, в т.ч. о В. Н. Кирмановиче.

**Кобрына** ганаровыя грамадзяне. **Уладзімір Мікалаевіч Кірмановіч //** Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня.

**Кирманович Владимир Николаевич** : некролог // Кобрынскі веснік. – 2001. – 10 лютага.

**Шугай, А.** 60-гадовы юбілей СШ № 2 / А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 1995. – 15 лістапада. – С. 3.

У розныя гады ў СШ № 2 вучыліся, працавалі заслужаныя і знакамітыя выпускнікі і настаўнікі школы.

**Вуліца** Кірмановіча // Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых» : дадатак да даведніка аб вуліцах Кобрына, якія носяць імены ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2005. - 4 с.

**Ганаровыя** грамадзяне горада Кобрына. **Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2020. – С. 11-14 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**105 гадоў** з дня нараджэння У. М. Кірмановіча (1919) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 124.

**Владимир Николаевич Кирманович** [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 01.03.2019.

**Кирманович Владимир Николаевич** [Электронный ресурс] // Википедия : свободная энциклопедия. - Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki/ Кирманович,_Владимир_Николаевич/ - Дата доступа: 04.04.2019.

**Кирманович Владимир Николаевич** [Электронный ресурс] // Герои страны. - Режим доступа: http://www. warheroes.ru/hero/. - Дата доступа: 14.04. 2019.

**Мемориальная** доска Кирмановичу [Электронный ресурс] // Туристический Кобрин. – Режим доступа: http://ikobrin.ru/kobtur-kirma.php. – Дата доступа: 14.04. 2019.

**5 лістапада** 2019 г. - 100 гадоў з дня нараджэння Кірмановіча Уладзіміра Мікалаевіча [Электронны рэсурс] // Краязнаўства Берасцейшчыны. – Рэжым доступу: http://kb.brl.by/index.php/homehttp – Дата доступу: 02.08.2020.

# ЗМЕСТ


**АД СКЛАДАЛЬНІКА** 3

**БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС** 5

*Дзяцінства і юнацтва* 5

*Ваенная служба* 7

*Подзвіг Героя Савецкага Саюза* 9

*Пасляваенныя гады* 12

*Памяць* 16

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** 21

*Аб жыцці і дзейнасці* 21

Даведачнае выданне

# Залатая зорка Кобрына

Біябібліяграфічны паказальнік
да 100-годдзя з дня нараджэння
**Уладзіміра Мікалаевіча Кірмановіча**

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп'ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Камп'ютарны дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп'ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая
цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by